УДК 882.6 – 1

*Т.І. БОРБАТ*

# СПЕЦЫФІКА РЭЦЭПЦЫІ ПАЭТЫЧНАГА ЗБОРНІКА С.ГРАХОЎСКАГА "ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ" Ў КАНТЭКСЦЕ ЧАСУ

З 60-х гадоў у беларускай паэзіі, як і наогул ва ўсёй літаратуры, пачаўся новы этап развіцця. "У паэзію, заўважае М. Арочка, уварваўся нібы парыў ачышчальнай навальніцы з зіханнем бліскавіц, гулам грымотаў <...>. Паэтаў захапіла ўжо сама магчымасць разняволенай стыхіі творчага маўчання, магчымасць грамадска-актыўнага служэння, сцвярджэнне чалавечага права на ўласнае выказванне, свой погляд, думку <...>" [1, с. 122].

Менавіта ў гэты час пачынаецца другі этап творчай дзейнасці С.Грахоўскага, для якога былі характэрны інтэнсіўны духоўны пошук, узмацненне філасафічнасці, паглыбленае пачуццё Часу і Гісторыі. У 1958 годзе, пасля доўгіх гадоў маўчання, выйшаў яго першы зборнік вершаў, які называўся "Дзень нараджэння".[1] Назва зборніка шмат абяцала[2], але ці нарадзіўся новы, якасна іншы пісьменнік? Звернемся да верша, які даў назву кнізе. Цікава, што назва не адпавядае яе зместу.[3] Чакаецца, што ў вершы "Дзень нараджэння" С.Грахоўскі будзе гаварыць пра сваё творчае нараджэнне, сваё вяртанне ў паэзію. Вось пачатак твора, здаецца, з праекцыяй на ўласны лёс: *"Яшчэ на ўзлессі снег ляжыць, // Але шпакі ужо шчабечуць, // <...> Ідзе вясна, а не адліга, // З вятрамі, ліўнямі, цяплом: // І крыгі крушацца аб крыгі, // А хутка грымне першы гром"* [3, с. 12]. Хочацца думаць, што гаворка распачалася пра вясновае "пераадраджэнне" паэта, пра "хрушчоўскую адлігу", але не – даведваемся, што вось у такі вясновы дзень нарадзіўся хлопчык у Сімбірску, "чалавек з вялікім сэрцам і натхненнем" [3, с. 12]. Аўтар выкарыстоўвае агульнавядомыя ў той час сентэнцыі, думкі, выразы (па-новаму, аднак, гучыць выраз "у Волзе вымытае сонца"). Твор апявальны, без унутранай палемікі і супрацьдзеяння. Такім жа расцягнутым атрымаўся і верш "На Волзе" (зноў пра Леніна), які таксама будуецца па звыклых асацыяцыях і стэрэатыпах. Паэту замінае пэўная расцягнутасць, бракуе эканоміі ў думках і фразах. Якаснае перараджэнне не адбылося: С.Грахоўскі, які столькі перапакутаваў, прайшоў канцлагеры, ссылку, маральнае прыніжэнне, па-ранейшаму паплыў па рацэ колішніх стэрэатыпаў, застаўся на хвалі ўзаконенай, апявальнай паэзіі, не адразу загаварыў пра перажытае. І не толькі таму, што гэта было забароненай тэмай у друку, але, як слушна заўважае Л.Гарэлік, адмова паказваць перажытае ў турмах і канцлагеры была "своеасаблівай псіхалагічнай рэакцыяй на нечалавечае паднявольнае жыццё" [2, с. 232]. У той час, каб кніжка трапіла ў друк, пісьменнікі абавязкова ўключалі ў яе "ідэалагічна вытрыманыя" творы.

Першы зборнік адкрываецца лірычным вершам "Маё пакаленне." Твор навеяны ўражаннямі дзяцінства і напоўнены мастацкім асэнсаваннем жыццёвага

[1] Першы зборнік мог бы выйсці з друку значна раней. Яшчэ ў пачатку 30-х гадоў паэтам быў падрыхтаваны вершаваны зборнік (палітрэдактар В.Барысенка), аднак А.Кучар, які рэцэнзаваў кнігу, да друку яе не дапусціў (з гутаркі Борбат Т.І. з С.І.Грахоўскім, запіс зроблены 28.10.97).

[2] Па прызнанні самога С.Грахоўскага, кніга "азнаменавала другое нараджэнне ў літаратуры і пачатак творчай сталасці" [4, с. 138].

[3] Дарэчы, ў кнізе прозы "Сустрэча з самім сабою", у цэнтры якой, як чакалася, не аўтар-апавядальнік са сваім унутраным светам, а вобраз аднаго з персанажаў, які "сустракаецца з самім сабою", вяртаючыся на месца сваёй маладосці.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

шляху. Адчуваецца жывая сувязь 20 – 30-х гадоў з сённяшнім днём. Паэт з гонарам, але разам з тым проста і шчыра гаворыць пра сваё пакаленне, якое *"Валіла тайгу і драбіла каменне, // Закладвала домны, капала каналы – // Лажылася позна, а рана ўставала, // Жыло у палатках у сцюжу і ў буру, // Каб горад узняўся хутчэй на Амуры* <...> *"* ("Маё пакаленне" [3, с. 4]). Праз асабістае, эмацыянальна-псіхалагічнае ўспрыняцце здабыткаў мінулага паэту ўдаецца ярчэй адлюстраваць сучаснае і апяваць "гераічныя дні". Сёння ўжо вядомыя вытокі сапраўдных прычын такога гераізму і энтузіязму, якія былі вынікам не толькі рамантычных парыванняў, а і грубага беззаконня, гвалту над чалавекам. Лірычны герой гэтага верша (дарэчы, як і многіх іншых) адпавядае створанаму тагачаснай літаратурай і самім жыццём ўзору савецкага чалавека, які на першае месца ставіць грамадскія справы. Таму многія радкі верша гучаць залішне дэкларатыўна і пафасна, ужываюцца агульныя, абыходкавыя фразы: *"Куды б ні вяла нас крутая дарога, // За намі заўсёды ідзе перамога – У льды Антарктыды, у неба прасторы, // Дзе новыя ўсходзяць савецкія зоры"* [3, с. 5]. Шмат у творы агульшчыны, апявання, плакатнасці, пераважаюць стэрэатыпы, штампы. Верш гучыць як своеасаблівая агітка. І ў той жа час паэт выступае ад імя свайго "я", падае ў скарочаным выглядзе ўсю гісторыю свайго пакалення: згадвае Халхін-Гол, Сталінград, Буг і Ленінград. Ужо ў гэтым творы праявілася майстэрства С.Грахоўскага падаваць карціны, паўныя жыццёвыя сцэны (сцэна ў "цяплушцы" – хлопчык на каленях ў салдата-чырвонаармейца), хоць гэта канкрэтыка, натуральна, плакатная. Твор стылёва нявытрыманы, неўладкаваны.

У вершы паэт выкарыстоўвае цытаты з іншых твораў, рэмінісцэнцыі: *"І я, ашчаперыўшы шыю худую, // Услед паўтараю за ім: // "Мы наш, мы новы свет збудуем, // Хто быў нічым, той стане ўсім"* [3, с. 3].

Пераказ вядомага стане ў далейшым звыклым прыёмам С.Грахоўскага. І гэта можна было б успрымаць як праяву постмадэрнізму, інтэртэкстуальнасці, "міжтэкставасці", калі б С.Грахоўскі свядома і знарок не абраў рэалістычны шлях. Гэта ўжо значна пазней, у канцы 80-х і ў 90-я гады, выспее і прарвецца бурны пратэст з сарказмам і сатырай супроць нялюдскіх, бязглуздых парадкаў, а пакуль што ён піша ў звыклай, апявальнай манеры: *"Вось так у цяплушках, у дымных бараках // Мае аднагодкі раслі. // Не ведалі мы, што ужо аб рабфаках // Ільіч гаварыў у Крамлі, // Што ён ужо бачыў агні Днепрагэса, // Адзначыў на карце Кузбас* <...>*"* [3, с. 4].

Аўтар не толькі выкарыстоўвае прамыя цытаты ці рэмінісцэнцыі, пранікаюць у яго паэзію нават чужыя рытмы, рыфмы ("Шчырасць", "Песня будзе жыць", "Уральская рабіна"). Напрыклад, у вершы С.Грахоўскага "Уральская рабіна" так і чуецца песня "Мчится тройка удалая" М.Глінкі: *"Плывуць за вокнамі бары, // Мільгаюць бездані і кручы, // Стаяць рабіны на гары, // Нібы нявесты ў дзень заручын"* [3, с. 30]. Верш напісаны ў самы разгар савецка-кітайскай дружбы. Матывы дружбы паміж краінамі народнай дэмакратыі ў адпаведнасці з той ідэалогіяй, якая панавала ў час напісання гэтых твораў, пранізваюць і верш "Нёман і Вісла": *"Нёман і Вісла, як брат і сястра, // Коцяцца борам і лугам, // І плытагоны пяюць ля кастра // Песню пра блізкага друга"* [3, с. 32].

Не вылучаецца навізной вобразна-выяўленчых сродкаў і верш "Айчына" [3, с. 6]. Ва ўяўленні паэта Айчына ўсеагульная, савецкая, рысы яе не канкрэтызуюцца: *"Што ты люляла, што казала казкі, // Што за руку ў дарогу павяла, // Што мне свае і клопаты, і ласку, // І шчодрасць, і суровасць аддала"* [3, с. 6]. Гэта яшчэ не "свая" Радзіма, што пачынаецца з таго куточка, дзе нарадзіўся і вырас, з якім звязаны самыя светлыя ўспаміны.

Айчына вельмі сурова абышлася з самім Грахоўскім, з яго пакаленнем, яго паплечнікамі. І таму ўражваюць словы: *"Калі ты часам і нахмурыш бровы, // На*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*маці не пакрыўдзяцца сыны"* [3, с. 6]. У вершы выяўляецца самаахвярнасць, уласцівая афіцыйнай ідэалогіі, таталітарнаму рэжыму. Хаця і прарываюцца кранальныя, канкрэтныя дэталі ("шчаслівы, што за руку ў дарогу павяла"), верх бяруць ружовыя заклікі, лозунгі: *"Ты нас вяла на справядлівы бой", "Ты гадавала, ты давала сілу, // Ад гора берагла сваіх сыноў"* [3, с. 6].

Мала клапоціцца аўтар аб свежасці рыфмы, яе багацці, своеасаблівасці і ў вершы "Дарога да шчасця." Так, калі ў папярэднім творы была ўжыта рыфма "бой-табой" [3, с. 6], то ў гэтым – "у бой-сабой" [3, с. 11].

Дарога да шчасця, на думку паэта, – гэта дарога да рэвалюцыі. Яшчэ доўга давялося ісці С.Грахоўскаму да ўсведамлення таго, што ўсялякія рэвалюцыі прыносяць няшчасці. Прынамсі, першая руская рэвалюцыя вяла, мабыць, да дэмакратыі, гэтая ж, кастрычніцкая, замацавала дыктатуру. У вершы пераважаюць знакі афіцыёзу, падаецца вобраз чырвонага сцяга, на якім "гараць, як зоры, заўжды жывыя словы Ільіча", пераказваюцца агульнавядомыя ісціны агульнавядомымі фразамі. Нібыта з перадавіцы, з падручніка гучаць словы *"Каб болей не ведаць паноў і цара, і Ленін гаворыць: "Сягоння пара"* [3, с. 10]. Толькі дзе-нідзе прарываецца ў творы нешта сваё, паляшуцкае: *"На Расію, вырачыўшы бельмы, // Рурскія паўзуць браневікі"* [3, с. 9]. Гэтыя радкі гучаць грубавата і вульгарна, выбіваюцца з кантэксту ўсяго твора, але, прынамсі, яны ўжо належаць менавіта С.Грахоўскаму.

Прарываюцца ў вершы і свежыя, новыя рыфмы: "зыркі – бесказырках" [3, с. 11], "юнкеры – закурыў" [3, с. 11], "змроку – крокі" [3, с. 10]. Арыгінальнай паўстае фраза *"І за сталом Часовага Урада прысеў матрос і люльку закурыў"* [3, с. 11]. У кантэксце сказанага згадваецца верш Я.Баршчэўскага "Бунт хлопаў", у якім хлоп сеў за панскі стол і паводзіў сябе, як блазен, парадыраваў пана.

Аднак з канца 60-х – пачатку 70-х гадоў у творчасці паэта адбываецца працэс пераацэнкі каштоўнасцей, узрастае ўвага і цікавасць да лёсу чалавека. Прыйшло адчуванне сталасці, і паэт, узбагачаны жыццёвым вопытам, глыбей, удумней глянуў на ўсё – на творчасць, навакольны свет. У вершах скрозь пануе святочны настрой, прага дзеяння; яны перапоўнены энергіяй, якая выяўляецца і ў радаснай адкрытасці жыццю ("Плынь", "Хваляванне", "Паверка"), і ў багацці пачуццяў, якія ўбіраюць у сябе вясёлы досціп, адчуванне далучанасці да ўсяго, што робіцца навокал ("Трывожная ноч", "Званы", "Боль", "Бяссмерце"). Лірычнае перажыванне часам набывае публіцыстычны характар, але ў цэлым паэтычны свет С.Грахоўскага насычаны рэаліямі штодзённага жыцця.

Лірызм усё больш настойліва пранікае ў паэзію С.Грахоўскага, аднак не без повязі з апавядальнасцю. Не зліццё, не адзінства, а менавіта повязь, калі гэтыя два струмені пераліваюцца побач і дапаўняюць адзін аднаго. Характэрна, што лірызм паэта звязаны з развагамі, якія былі вынікам асэнсавання жыццёвых фактаў, падзей ("Першая песня", "Песня будзе жыць," "Я цябе прыгадаў"). І, як заўважае А. Лойка, "калі ўзяты паэтам повад грунтоўны, дык верш набывае важкасць і мастацкую закончанасць" [5, с. 190].

Інтанацыя большасці твораў размоўная: падаецца як бы своеасаблівае апавяданне ў вершах пра час ад сябе і пра сябе ў часе. Лірычны герой С.Грахоўскага ўспрымае свет адкрыта. У вершах шчыра перададзена праўда пачуццяў сучасніка, яго жыццярадаснасць, герой падпарадкоўваецца рытму часу, ён – у дарозе, у пошуку. Імклівасць часу, яго бег адчуваецца ў інтанацыі, рытме вершаў: *"Пытаеш, чаму мне з табой не сядзіцца, // Чаму, завітаўшы на некалькі дзён, // Я зноў ад'язджаю з утульнай сталіцы // У нейкі глухі і далёкі раён. // <...> Чаму я хаджу пехатой у завею, // Чаму не такі, як мужы у людзей. // Ты думаеш, – я ад вандровак сівею, // А я адчуваю, што стаў маладзей"* ("Прызнанне" [3, с. 21]).

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Але дарога пакуль што ў паэта мела нейкае абстрактнае, павярхоўнае праяўленне. Значна пазней у сваіх паэмах (не без уплыву паэмы А.Твардоўскага "За далью – даль") С.Грахоўскі канкрэтызуе гэты вобраз.

У кантэксце гаворкі пра паэзію С.Грахоўскага згадваюцца словы М.Ціханава, які пісаў, што "верш – гэта тая праўда, якую чалавек можа расказаць пра сябе і пра свет. <...> Калі паэт не адчувае дыханне эпохі на сваім твары – ён нічога не адчувае і няхай не спрабуе нават адлюстраваць эпоху, ён схлусіць ці адпішацца <...> неахайна і паспешна" (пераклад з рускай. – Т.Б. – [8, с. 304]). С.Грахоўскі добра адчуваў сваю эпоху. Эпоху грамадскіх зрухаў, энтузіязму, рамантычнай узнёсласці. Лірычны герой жыццё разумее як гарэнне, няспынны рух наперад, ён імкнецца не адстаць ад шпаркага бегу часу, яму хочацца ўсюды паспець, зверыць уласным сэрцам справы сучаснікаў: *"<...> Што жыць патрэбна толькі так, // Каб быць заўсёды ў дарозе, // Прайсці, дзе следу не было, // Каб у надзённай нашай прозе // Здабыць паэзіі святло"* ("Дакор сабе" [3, с. 37]). У аснове верша – банальныя ісціны: "Жыццё даецца толькі раз", "Бо што прайшло, таго не вернеш", "Шукаць, знаходзіць, // быць няспынным, // Не проста існаваць, // а жыць", – але ж яны неяк па-новаму выражаны, набіраюць такую сілу пераканання, што вабяць да сябе. Дзеяслоўныя рыфмы, занядбаныя, адкінутыя многімі паэтамі, добра спрацоўваюць у творы: "трачу – недастачу", "разгубіў – зрабіў", надаюць дынаміку лірычнаму выказванню: *"Бо што прайшло, таго не вернеш, // Не скажаш часу: "Пачакай"* [3, с. 36]. Гэта фраза стала крылатай і прыпісвалася П.Макалю, але ж раней за яго (у 1956 годзе) яе ўжыў С.Грахоўскі.

Канцоўка ж твора агульная, банальная: *"<...> Каб зазірнуць у тыя далі, // Куды нам суджана дайсці, // І, не спыняючыся, далей, // Дарогу пэўную знайсці, // І кожным крокам даражыць: // Шукаць, знаходзіць, // быць няспынным, // Не проста існаваць, // а жыць"* [3, с. 37].

Як заўважае М.Мішчанчук, такі бадзёры настрой, прагу самаахвяравання ў імя высокіх ідэалаў нельга лічыць набыткам менавіта паэзіі С.Грахоўскага 50 – 60-х гадоў. Гэта было ўласціва і маладнякоўцам, і паэзіі пасляваеннага дзесяцігоддзя (лірыка П.Броўкі, А.Куляшова, П.Панчанкі). Аднак "у рэчышча асноўнага гуманістычна-ўзрушанага накалу паэзіі пераходнага перыяду ў жыцці нашага грамадства такія вершы С.Грахоўскага ўпісваліся досыць арганічна" [7, с. 107].

Значна больш гавораць пра пакаленне не вершы-дэкларацыі, а вершы інтымнага плану ("Жонка", "Я цябе прыгадаў", "Не пойдзем сёння ні ў кіно, ні ў госці", "Мама", "Дакор сабе"). Так, у вершы "Я цябе прыгадаў" праяўляецца напорлівая лірычная ўсхваляванасць, узнёслая настраёвасць, што ўзмацняюцца градацыяй, нарастаннем пачуцця: *"Я цябе прыгадаў // Басаногаю, шустраю, тонкай. // Пад нагамі рассыпала // Раніца зерне расы, // І тады, у далёкія тыя часы, // Я цябе уяўляў // Залатою сасонкай"* [3, с. 47]. Як бачым, асацыяцыі рассыпаны, яны не нанізваюцца на адзін стрыжань. "Разрадка" правальваецца ў дэкларацыю, агульшчыну, рыторыку, адбываецца перабіўка рытму: *"Мы гарэлі ў агні, але нам не згарэць, // Навальніца прайшла, але нас не зламала"* [3, с. 47]. Страчана нешта цёплае, лірычнае. Яшчэ не можа С.Грахоўскі вырвацца з палону той паэзіі, што ідзе ад 30-х гадоў, калі паэтаў штурхалі на гладкапіс, на ўсхваленне і апяванне.

Узорам інтымнай лірыкі можна лічыць верш "Не пойдзем сёння ні ў кіно, ні ў госці", асноўная думка якога – "патрэбна так да старасці кахаць, як некалі кахалі ў маладосці" [3, с. 51]. Роздум, насычаны лірычным пачуццём, усхваляванасцю, грунтуецца на супастаўленні мінулага і цяперашняга часу: *"І уздыхаць, каханая, пакінь, // Што больш не вернеш маладосці. // А лепш паходзім па старым бульвары, // Дзе да вясны не падмятаюць снег <...>"* [3, с. 51]. Кранальна выпісана карціна сустрэчы закаханых у вершы "Снежаньскі ранак."

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Наогул, зборнік “Дзень нараджэння” насычаны мяккім лірызмам, выразнасцю ўражанняў; у той жа час у ім пераважаюць апісальнасць, падкрэслена-наіўная прастата асацыяцый. Жыццё паўстае ціхамірным, без пакут і болю, без канфліктаў і супярэчнасцей, без праблем. Спроба паэта адлюстраваць час ва ўсёй шматграннасці яго праяў яшчэ не знаходзіла выйсце на шырокі прастор лірычнага хвалявання, пераважала танальнасць од. Падобныя рысы, дарэчы, былі ўласцівы ўсёй паэзіі 60 – 70-х гадоў. В.Бечык у сувязі з гэтым слушна заўважыў: “Па-ранейшаму паэтаў нярэдка цягне да гучнага слова, рытарычных закругленняў <...>” [10, с. 241].

Кніга “Дзень нараджэння” не вызначалася цэласнасцю, адзінствам тэматыкі, глыбінёй, змястоўнасцю. На моцныя і слабыя бакі вершаў С.Грахоўскага справядліва ўказвалі А.Лойка [5], М.Мішчанчук [7, 8], С.Майхровіч [6], А.Яскевіч [11]. Крытыка, чаго і можна было чакаць, хваліла паэта за ружовы аптымізм, ружовы, які ўжо тады выступаў пад знакам “мінус”. Большасць крытыкаў разумела: не трэба перабіраць меру. Хваліла за вобраз Леніна, а на тое, што ён выглядае плакатна, ілюстрацыйна, што няма ў ім жывінкі, канкрэтыкі, не звярталася ўвагі [6, 11].

Былі і слушныя, справядлівыя заўвагі, адзначалася, што не ўсё адразу ўдавалася С.Грахоўскаму. Паэт, зазначалася ў крытыцы, часам бывае “звыш дэкларацыйным”, многія вершы (“Дыплом на годнасць чалавека”, “Дарога да шчасця”, “Спадчына”, “Ноч над Мінскам”, “Нёман”) нагадваюць “празаічны гладкапіс”, яны пазбаўлены кампазіцыйнага стрыжня, празмерна расцягнутыя і шматслоўныя. Некаторыя творы перапоўнены вобразамі-штампамі, агульнавядомымі паралелямі, у іх выкарыстоўваюцца пашыраныя ў той час выяўленчыя сродкі (“Айчына”, “Плынь”) [11]. У прыведзеных вершах пануюць ідэалагізацыя, упрыгожванне жыцця, суцэльныя аздобы. Гэта не праблемныя, не вострасацыяльныя творы. Напалоханы 30-мі гадамі, рэпрэсіямі, турмамі і ссылкаю, паэт яшчэ па інерцыі, з асцярогай, у ружовым святле падае навакольны свет. Таму ў многіх вершах, дзе няма праекцыі на ўласнае жыццё, бракуе рэалій з асабіста ўбачанага, перажытага, усвядомленага, патыхае эпігонствам, механічным перайманнем чужых узораў (“Дарога да шчасця”, “Дыплом на годнасць чалавека”, “Айчына”, “Мары ў нас і надзеі адны”). І, наадварот, дзе ёсць хоць маленькі прарыў на нешта сваё, там заўважаюцца цікавыя думкі, выслоўі, зразумела, з пэўнымі няўвязкамі, неадшліфаванасцю, але ж новыя і непаўторныя (“На таежнай дарозе”, “Белыя ліпы”, “Мама”). Навізны якраз і не хапае паэту ў першым зборніку. Яна прыйдзе пазней, калі ўсплыве ў свядомасці былое, у творах канца 80-х, у 90-я гады.

Але і ў першую кніжку прарывалася паэтыка ўспамінаў, і тады нараджаліся сапраўдныя, шчырыя творы. Адзін з іх – верш “На таежнай дарозе”. На глухой таежнай дарозе згубілася невялічкая хатка, у ёй ніхто не жыве, толькі ў сцюжу ці буран сюды заглядваюць падарожнікі, каб адпачыць і пагрэцца. Але ў хатцы заўсёды гарыць агеньчык, свецяцца два акенцы, заўсёды знойдзецца акрайчык хлеба. Герой верша клапоціцца, каб не згас агеньчык і ў хаце было цяпло: *“Вось і я, абагрэўшыся, дровы прынёс. // Хлеб пакінуў, крыху пастаяў ля парога. // Завіруха змаўкае, не страшны мароз, // І ніякая болей не зморыць дарога”* [3, с. 16]

Верш, можа, крыху расцягнуты, ёсць лішак рэалій, пэўная каструбаватасць *(“Каля печы – карэц у крынічнай вадзе, // Соль у шклянцы і свежага хлеба акраец // на шырокім і чыстым піхтовым стале, // На паліцы газеты за першае снежня”)* [3, с. 16], аднак, у цэлым твор добры і цікавы.

Закон выжывання ў тайзе – узаемадапамога і ўзаемапапярэджанне, гэта адзіны і вырашальны сродак для выжывання. Загадзя папярэдзіць, прадухіліць бяду, паклапаціцца пра іншага чалавека – тое, што найбольш уразіла пісьменніка ў Сібіры, што ён потым перадаў у аповесці “Ранні снег”. У такой жа таежнай хатцы пераначавалі Аляксей і Вера. Хатка іх прытуліла, абагрэла і душэўна зблізіла.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Клопат пра іншага, узаемавыручка паказана і ў апавяданні "Варнак", герой якога варыць страву ў тайзе на дваіх – а раптам яшчэ натрапіцца падарожнік? Мастацкаму адлюстраванню садзейнічаюць шматмерныя паводле свайго сэнсу рэаліі: вецер, які вые; рудая куга; адзінокія сані, якія ледзьве чутна рыпяць; адзінокі сахаты, які прабіў праз сумёт след; ледзяныя слупы ўздоўж дарогі; асіннік у белых латах; аганёк заінелае хаты; агеньчык на камінку; карэц у крынічнай вадзе; соль у шклянцы; шырокі і чысты піхтовы стол; газеты за першае снежня і інш. Вобразы заснежанай дарогі і хаткі пры ёй з двума акенцамі, ўтульнасць, створаная іншым, могуць прачытвацца як сімвалы цяжкай жыццёвай дарогі, на прасторах якой чалавек усё ж зможа знайсці выратаванне ад завірухі праз духоўнае далучэнне да адной з галоўных хрысціянскіх каштоўнасцей: прыгажосці ў клопаце пра духоўнае ўзвышэнне "блізкага свайго". Вобраз дарогі становіцца адным з вядучых у паэзіі С.Грахоўскага ("Дакор сабе", "Прызнанне", "Заўсёды ў дарозе", "Пачатак дарогі"). Дарога, шлях у паэта – сімвал руху, развіцця.

Глыбока разбіраючыся ў псіхалогіі чалавека, С.Грахоўскі выступае за адкрытасць сэрцаў, за цяпло і шчырасць у чалавечых паводзінах. Ён усімі магчымымі шляхамі даводзіць неабходнасць берагчы і памнажаць чалавечае ў чалавеку – чуласць, дабрату, праўдзівасць. Дабрата, на думку паэта, – паняцце не абстрактнае. Яна выяўляецца ў канкрэтнай сітуацыі, ёю надзелены канкрэтны чалавек. Дабрата – гэта і "скрылёк пазычанага сала", і "апошняя корка", якой герой гатовы падзяліцца з кожным... ("Багацце"). Як бачым, ужо ў першым зборніку паэта ідэя гуманізму становіцца скразной. Аднак С.Грахоўскі ў сваім гуманізме не ўзнімаецца да глабальных праблем, як вызначыў М.Мішчанчук, яго гуманізм "больш камерны, асабісты, замкнёны ў коле клопатаў і радасцяў зямных, тых, што побач з паэтам" [7, с. 110].

У зборніку С.Грахоўскага выявіліся і іншыя тэндэнцыі, якія ў далейшым вызначаць своеасаблівасць яго творчай манеры – уменне глыбока пранікаць у псіхалогію чалавека, паэтычна выяўляць сутнасць з'яў, пільна прыглядацца да дэталяў і рэалій навакольнага свету. Кніга "Дзень нараджэння" напоўнена настойлівым імкненнем творцы выпрацаваць сваю канцэпцыю часу, сцвердзіць свой погляд на свет, на чалавека ў ім, знайсці сваю тэму. Таму поруч са спадамі, са шкалярскімі зрывамі прабіўся прафесіяналізм, праявілася майстэрства, прастата і шчырасць пачуццяў, канкрэтыка рэалій. Многія творы пазней шліфаваліся, дапрацоўваліся.

### *ЛІТАРАТУРА*

1. ***Арочка М.М.*** Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства 1956 – 1965: Паэзія // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 т. / НАН Беларусі. Ін-т літ-ры імя Я.Купалы. – 2001. – Т. 3: 1941 – 1985 гг.
2. ***Гарэлік Л.*** Прапаведзь дабра // Полымя. – 1994. – № 2.
3. ***Грахоўскі С.*** Дзень нараджэння: Вершы. – Мн.: Дзярж. выд-ва БССР, 1958.
4. ***Грахоўскі С.*** Пражытае і перажытае // Пра час і пра сябе: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мн.: Беларусь, 1966.
5. ***Лойка А.*** Пошукі паэзіі // Полымя. – 1958. – № 10.
6. ***Майхровіч С.*** Вершы аб Радзіме // Літ. і мастацтва. – 1958. – 27 вер.
7. ***Мішчанчук М.І.*** Дабрата чалавеку патрэбна // Беларуская літаратура на сучасным этапе: Літ.-крыт. артыкулы. – Мінск: Выш. школа, 1983.
8. ***Мішчанчук М.*** Святло яго душы // На высокай хвалі: Літ.-крыт. артыкулы; Пад рэд. Д.Я. Бугаёва. – Мн.: Нар. асвета, 1980.
9. ***Тихонов Н.*** Писатель и эпоха: Выступления, лит. записи, очерки. – М.: Сов. писатель, 1974.
10. ***Ярош М.Р., Бечык В.Л.*** Беларуская савецкая лірыка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979.
11. ***Яскевіч А.*** Голас сэрца // Маладосць. – 1959. – № 2.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

## SUMMARY

*The article deals with the specific character of the reception of S. Grakhovsky's first collection of poems "Birthday" (1956) in the context of time, The author analyses thematic and genre-stylistic variety of the poet's lyrics. It was his first collection of poems that contained tendencies which later predetermined S. Grakhovsky's creative peculiarities such as the ability to penetrate deeply into human psychology to notice all the details of the surrounding world. The book "Birthday" is filled with an insistent desire to work out his own conception of time, his own notion of the world, of a man in it, to find his own theme.*

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова